

Дзвінскі ўзгорак

Кроч на свой родны,
дзвінскі ўзгорак,
каб глядзець у будучую сінь

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА, №6 (75)
КРАСАВІК 2018 ГОДА

ГРАМАДЗЯНСКАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

ТАЛАКА ВА ЎРОЧЫШЧЫ ХАЙСЫ

14 красавіка, сябры ініцыятывы «Хайсы» наведалі «віцебскія Курапаты».

Наведалі, каб прыбраць пасьля зімы напярэдадні Радуніцы створаны з ініцыятывы грамадзкасьці народны мэмарыял і ўшанаваць памяць бязьвінных ахвяраў сталінскага рэжыму.

Грамадзкія актывісты з 2014 году намагаюцца пераканаць улады Віцебскага раёну і Віцебскай вобласьці ў тым, што лясны масіў уздоўж чыгункі ў кірунку Віцебск – Гарадок стаў апошнім прытулкам для тысячаў беларускіх грамадзянаў. Улады пакуль не наважваюцца прызнаць відавочнае, адмоўчваюцца і ніякіх афіцыйных заяваў ня робяць.

Больш за трыццаць мэталёвых і драўляных крыжоў усталявалі за гэты час сябры ініцыятывы ля брацкіх магілаў, эксгумаваных вайскоўцамі 52-га пошукавага батальёну.

Блізу чатырох гадзінаў спатрэбілася актывістам, каб збольшага прыбраць вялікую тэрыторыю мэмарыялу ад зімовага ламачча, ускласьці кветкі, запаліць зьнічкі. Адна з алешынаў звалілася на крыж ды пашкодзіла плястыкавую шыльду, прымацаваную ў памяць Антона Рамашкі, які паводле расповедаў сьведкаў быў тут забіты.

Гэтым разам да крыжоў прымацавалі некалькі новых шыльдаў з імёнамі рэпрэсаваных грамадзянаў, якія з пэўнай доляй імавернасьці былі пахаваныя менавіта ў гэтым лесе.

Латыш Антон Шпелес жыў у вёсцы Лужасна. Ён быў абвінавачаны ў шпіянажы на карысьць Латвіі. Дата расстрэлу – 28 студзеня 1938 году. Разам зь ім у тую ноч нкусаўцы расстралялі яшчэ 99 чалавек.

У 2015 годзе пляменьніца Антона Аксяверавіча разам са сваімі роднымі наведала ўрочышча Хайсы. Сваякі рэпрэсаванага ўзялі ў адной з магілаў два вядры зямлі, завезьлі на лужасьнянскія могілкі ды паставілі помнік побач з пахаванай на кладах жонкай.

Яшчэ адна дата масавых забойстваў пад Віцебскам, вядомая актывістам, – 1 сьнежня 1937 году. Тады было расстраляна 112 чалавек. Сярод іх – шмат прадстаўнікоў віцебскай інтэлігенцыі, у тым ліку вядомыя віцебскія мастакі Ян Гаўрыс, Яўхім Мінін, браты Пётар і Хрыстафор Даркевічы. Сябры ініцыятывы «Хайсы» мяркуюць, што яны былі забітыя недзе тут, на адным з пагоркаў расстрэльнага лесу.

Мабыць, дзесьці побач быў пахаваны і рабочы вагоннага дэпо Віцебску паляк Казімір Вяржбіцкі, расстраляны ў адзін дзень са сваёй жонкай, хатняй гаспадыняй Соф'яй Вяржбіцкай.

«Восемдзесят гадоў прамінула з часоў сталінскіх рэпрэсіяў, але Беларусь аж дагэтуль не ачуняла ад тых трагічных падзеяў», – заявіў кіраўнік ініцыятывы «Хайсы» Ян Дзяржаўцаў. *– Утой час, калі мы разам з вамі ўшаноўваем памяць нашых продкаў, ажно чатыры міліцыянты кантралююць нашыя паводзіны і нават размовы. Ці не дзікунства гэта? Няўжо яны думаюць, што мы зладзім у лесе для зьвяроў і птушак несанкцыянаванае масавае мерапрыемства? Да якой ступені дзікунства трэба дайсьці, каб гэтак ставіцца да сваіх грамадзянаў ды марнаваць народныя сродкі!»*

Якаў Дрозд

ПРАВАВАЯ АСЬВЕТА

«НЕ!» – СЬМЯРОТНАМУ ПАКАРАНЬНЮ

На працягу трох дзён у Віцебску праходзіў прававы ўік-энд.

А распачаў трохдзённы цыкль асьветніцкіх імпрэзаў прадстаўнік праваабарончага цэнтру "Вясна", каардынатар кампаніі "Праваабаронцы супраць сьмяротнага пакараньня" ў Беларусі Андрэй Палуда, які ўвечары 20 красавіка прачытаў лекцыю ў арт-цэнтры VZAP.

Як адзначыў Андрэй Палуда, кампанія супраць сьмяротнага пакараньня дзейнічае ў двух накірунках: юрыдычным (праца ў беларускіх і міжнародных судох з кейсамі, зьвязанымі са сьмяротнымі прысудамі) і інфармацыйным (тлумачэньне неабходнасьці адмовы ад сьмяротнага пакараньня).

На жаль, на побытавым узроўні існуе яшчэ шмат каламесіцы ў пытаньні сьмяротнага пакараньня. Разам з тым сярод прадстаўнікоў заканадаўчай улады прысутнічае пэўнае ўсьведамленьне неабходнасьці ўкараненьня ў Беларусі эўрапейскіх і агульначалавечых стандартаў у галіне правоў чалавека.

Калі на сайтах пачытаць камэнтары пад артыкуламі, прысьвечанымі праблеме сьмяротнага пакараньня, то яны часьцяком прасякнутыя нянавісьцю ў дачыненьні ня толькі да злачынцы, асуджанага на вышэйшую меру пакараньня, але і да ягоных сваякоў. І тут рэч у тым, што сама наяўнасьць сьмяротнага пакараньня ў нацыянальным заканадаўстве немінуча раскручвае сьпіраль нянавісьці.

На існаваньне ў краіне сьмяротнага пакараньня ўплывае і пазыцыя прэзыдэнта. Яго асабістае меркаваньне спрыяе ня толькі захаваньню сьмяротнай кары, але ўплывае нават на вынікі разгляду касацыйных скаргаў асуджаных на сьмерць асобаў. Асабліва з улікам таго, што менавіта кіраўнік дзяржавы прызначае ўсіх чальцоў судовага корпусу. Па вялікім рахунку, ёсьць пазыцыя, ад якой залежыць усё.

Дзіўна, але нават скасаваньне кары сьмерцю не дае гарантыі яе невяртаньня ў нацыянальнае заканадаўства ў будучыні. Гісторыя ведае прыклады, калі адмененае сьмяротнае пакараньне праз нейкі тэрмін вярталася ізноў. Так, за савецкім часам сьмяротнае пакараньне адмянялася тры разы, а ў Расейскай імпэрыі, складовай часткай якой была і Беларусь, – пяць разоў. У гэтай сытуацыі падаецца важным не прыпыняць асьветніцкую дзейнасьць, як што да правоў чалавека ўвогуле, гэтак і да праблематыкі сьмяротнага пакараньня ў прыватнасьці.

Якаў Дрозд

Чытайце сайт Віцебскага раёна: http://vicebskreg.by

ІМПРЭЗА

ПРЭМ'ЕРА ФІЛЬМУ ПРА ЛІКВІДАТАРАЎ

Віцебскія ліквідатары наведалі прэм'еру фільму, героямі якога яны сталі.

Імпрэза адбылася 23 красавіка, напярэдадні чарговых угодкаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. На прэм'еру дакумэнтальнага фільму «Сам-насам з памяцьцю» ў глядацкай залі віцебскага арт-пабу "Торвальд" сабралася зацікаўленая публіка. На прагляд прыйшлі ня толькі віцебскія ліквідатары аварыі на ЧАЭС, але й грамадзкія актывісты ды прадстаўнікі культуры.

Стварылі фільм журналісты Алена Сьцяпанава, якая ўзяла на сябе ролю рэжысэра ды прадусара, і Вікторыя Дашкевіч, якая выступіла як аўтар ідэі, сцэнарыст ды агучыла стужку. Зьняў фільм апэратар Вячаслаў Лазараў. Ролі галоўных герояў у гульнявых эпізодах выканалі Ігар Мацьвееў (у вобразе Анатоля Гнеўкі) і Алег Квяцінскі (у вобразе Сяргея Іконьнікава).

Як адзначыла Алена Сьцяпанава, якая распачала прэм'ерную імпрэзу, няважна, што героямі фільму сталі толькі два чарнобыльцы, Анатоль Гнеўка ды Сяргей Іконьнікаў. Гэты фільм прысьвечаны ўсім ліквідатарам.

Вікторыя Дашкевіч сьцісла распавяла пра тое, як зьявіўся фільм:

Перад праглядам Алена Сьцяпанава прадставіла прысутным на імпрэзе відэаапэратара Вячаслава Лазарава, праца зь якім сталася шчасьлівай знаходкай для аўтараў ідэі стварэньня фільму.

Фільм быў прыняты гледачамі з прыязнасьцю і адзначаны дружнымі воплескамі.

Першым выказаўся былы супрацоўнік МУС Аляксандар Мікулін, які выконваў у чарнобыльскай зоне спэцыфічную справу: змагаўся з марадзёрамі. Ён станоўча ацаніў кінастужку віцебскіх журналістаў:

«Немагчыма было тады нават падумаць, што ўдзельнікаў ліквідацыі аварыі на ЧАЭС праз трыццаць гадоў забудуць. Цяпер мы не ліквідатары, мы – пацярпелыя. Апошнім часам я часта задаюся пытаньнем: «Ці здатныя цяпер людзі ахвяраваць сваім здароўем, як некалі ахвяравалі мы?»

Добра зьнялі. Адно хацелася б, каб была нейкая радасьць жыцьця пры канцы. Фільм удалы, дзякуй вам!», – падсумаваў Аляксандар Мікулін.

Анатоль Гнеўка прыгадаў эпізод, калі ягоны падначалены ў некалькі разоў перавысіў час свайго знаходжаньня ў зоне дэзактывацыі, імкнучыся падчапіць і скінуць з даху рыдлёўкай радыяцыйнае рэчыва.

«Вось зь якім патрыятызмам працавалі нашы вайскоўцы-беларусы. Ад імя прысутных на праглядзе ліквідатараў хачу падзякаваць усёй здымачнай групе, якая брала ўдзел у падрыхтоўцы фільму. Вялікі вам дзякуй! Так трымаць! І такіх выхаваўчых фільмаў мусіць быць болей, бо яны вучаць патрыятызму!», – зазначыў Анатоль Лявонавіч.

Словы падзякі выказала і аўтарка фільму Алена Сьцяпанава – на адрас загадчыцы музэю зь вёскі Заронава Людмілы Нікіцінай, якая дала з фондаў музэю рэквізыт для здымак гульнявых эпізодаў фільму.

На разьвітаньне кожны ўдзельнік ліквідацыі аварыі на Чарнобыльскай станцыі атрымаў ад арганізатараў невялічкі падарунак, дзе самай дарагой рэччу быў дыск з фільмам «Сам-насам з памяцьцю».

С.Горкі

СПАДЧЫНА

БОТАНИК ИЗ-ПОД ВИТЕБСКА

История Великолетчанского ботанического сада уводит нас в начало XX века. Она знакомит с семьей Адамовых, которые владели здесь поместьем. Семья жила в Петербурге, а в Летцы приезжала на лето.

После окончания университета, в 1890-1900 годах, Адамов окончательно переехал в свое наследное поместье в Больших Летцах и разбил там ботанический сад, где изучал и выращивал растения.

К 1910 году в Великолетчанском саду оказалось 344 вида древесных (23 хвойных и 13 лиан), 664 травянистых и полукустарниковых растений, 13 видов папоротников. Здесь были собраны растения из разных мест Южного полушария и акклиматизированные представители азиатской, западноевропейской и других флор..

Здесь была коллекция растений-альбиносов, а в конце 1924 года — теплица с 300 видами экзотов, питомник с более чем 2000 видами лекарственных, технических, остроприправных, ягодных растений и ботанический музей. Но больше всего Адамов гордился коллекцией сирени, которая попеременно цвела в его саду на протяжении нескольких месяцев. Семена присылали ученому из Петербурга, Варшавы, Парижа, Женевы и Академии наук России. Адамов издавал каталоги растений своего сада, чтобы наладить обмен.

А в 1904 году ученый обнаружил у озера Летцы неизвестный вид растения и спустя 20 лет наблюдений описал его под назвнием Alisma submersum. А будучи в Слуцке Адамов обнаружил белый тополь нехарактерной для тех краев формы. Но такое дерево оказалось знакомо ученому: похожее успешно росло в одном из витебских скверов.

Владимир Владимирович Адамов был знаменит не только в России, но и в Европе, участвовал в экспедициях, создавал ботанические сады, обучался в Кёнигсбергском университете, в Париже. Во время Первой мировой войны Адамов проводил курсы для воинов-инвалидов, а позже обучал и в своем имении. Ученый был в хороших отношениях с крестьянами, обучал детей грамоте, рассказывал им о природе. Это помогло ему после революции, когда Адамов потерял все и бедствовал. Богатый сад выручал его даже в это тяжелое время. Усадьбу ученого отдали под нужды организации, а ему оставили только несколько комнат на первом этаже.

Чтобы спасти созданный за 18 лет сад-коллекцию, Адамов предложил обучать на его базе приемам сельского хозяйства. Но ему отказали, а Большие Летцы с 1918 года отдали для культурно-просветительных целей. Позже Адамов добился того, чтобы здесь была создана заповедная зона в 16-19 гектаров.

За 1915-1918 годы в саду Адамова погибло 4% древесных пород, около 15% многолетников, 40% лекарственных растений, а из 200 видов в оранжерее осталось только 80.

Осенью 1923 года сад передали Витебскому сельскохозяйственному техникуму, часть растений перевезли в Витебск, где при участии Адамова и был создан ботанический сад. В 1924 году Великолетчанский сад перешел к Белорусскому ветинституту.

Адамов преподавал в Витебске, около 1924 года переехал в Минск, где вместе с сестрой жил на улице Коммунистической, дом № 3А, после — в Горки. После 1934 года ученый перебрался в Крым, где работал в Никитском ботаническом саду. Спустя четыре года знаменитый ученый был уволен в 65-летнем возрасте.

Адамов тяжело болел і просил коллегу об устройстве в одном из домов для престарелых ученых или в клинике для хроников.

В 1939 году Владимир Владимирович умер в больнице в Севастополе и был похоронен на городском кладбище в Феодосии. Даже находясь при смерти,

Адамов не расставался со своими книгами, но многие труды ученого так и не увидели свет.

В память об Адамове был установлен бюст на Аллее Славы знаменитых земляков в Новке. Планируется, что будет также создан музей ученого на базе усадьбы или старого здания местного сельсовета.

Но самой живой памятью про знаменитого ботаника стал фестиваль «Адамаўскі фэст», который уже три года подряд привлекает в Летцы любителей истории и природы.

Анастасия Вереск
«Витебский курьер»

ЗДАРЭННІ

РЭХА ВАЙНЫ

У Віцебскім раёне на ўзараным полі выявілі вялікую колькасць мін і снарадаў.

22 красавіка, недалёка ад вёскі Белынавічы Віцебскага раёна, трактарыст мясцовага сельгаспрадпрыемства араў зямлю. Праз пару гадзінаў працы плуг зачапіўся за нейкі жалезны прадмет. Кіроўца спыніў тэхніку, падышоў да плуга і заўважыў, што з зямлі тырчыць іржавы снарад. Ён патэлефанаваў аграному, які і паведаміў у міліцыю пра знаходку.

Група размінавання вайсковай часткі 5524 на чале са старэйшым прапаршчыкам Вадзімам Верамеюком выявіла 48 артылерыйскіх снарадаў 45 мм і 22 мінамётныя міны часоў Другой сусветнай вайны.

Боепрыпасы былі вывезены ў бяспечнае месца і знішчаныя, паведамляе УУС Віцебскага аблвыканкама.

Нагадаем, у верасні, у лесе паблізу вёскі Касачы Віцебскага раёна былі выяўлены 29 супрацьціпяхотных мін, 19 артылерыйскіх снарадаў, 4 артылерыйскія выбухоўнікі і 3 ручныя асколачныя гранаты.

Ян Сьведка

ТЕЛО НАШЛИ В ВОДОЁМЕ

В Витебском районе нашли тело мужчины, пропавшего полгода назад.

В водоеме у заброшенного овощехранилища возле агрогородка Октябрьская под Витебском 19 апреля нашли тело пожилого мужчины, пропавшего в ноябре прошлого года, сообщает милиция региона.

66-летний житель Витебска Владимир Санько вечером 10 ноября ехал на автобусе № 29 в сторону микрорайона Медцентр, вышел там на конечной остановке. Затем его видели возле автостоянки на улице Петруся Бровки. Предположительно, мужчина направился в сторону агрогородка Октябрьская. С тех пор о мужчине ничего не было известно. По факту исчезновения возбудили уголовное дело.

Мужчину искали вплоть до 19 апреля. В этот день в поиске участвовали около 30 человек милиционеров, спасателей, военных. С воздуха предполагаемый квадрат поиска обследовали с помощью квадрокоптера. Возле овощехранилища за агрогородком Октябрьская один из поисковиков обнаружил тело в водоеме. Его достали водолазы. В кармане одежды нашли паспорт на имя Владимира Санько и мобильный телефон.

Tut.by

МЕМАРЫЯЛ

НОВЫЙ ПРОЕКТ ВЕТЕРАНА

В Витебском районе молодежь помогает ветерану создавать «Стену Памяти».

На протяжении последних тридцати лет участник войны Виктор Терещенко, которому сейчас 92 года, в агрогородке Копти Витебского района создает воинский мемориал.

До агрогородка Копти добираемся на автомобиле вместе с участниками Витебского областного общественного объединения военно-исторической реконструкции «Товарищи по оружию». В него входят люди разных профессий, которых объединяет интерес к Великой Отечественной войне. Его члены реконструируют боевые события времен ВОВ, униформу, быт солдат, проводят тематические акции.

Ребята о ветеране из Коптей и его задумке установить «Стену Памяти» узнали от участника объединения, инженера авиакомпании «Белавиа» Юлии Литецкой. Девушку восхитила история Виктора Терещенко, и она решила не оставаться в стороне. Разместила пост в социальных сетях, призывая помочь реализовать идею. В итоге было собрано около Br380.

Возле мемориала в Коптях нас встречает Виктор Терещенко. Он показывает молодым работникам схему «Стены Памяти», собственноручно нарисованную на фрагменте обоев.

Ветеран делится своими замерами и видением будущего объекта. Саму стену он вместе со знакомым местным жителем отлил еще прошлым летом. Она будет иметь ниши, на которых каждый посетитель мемориала сможет поместить табличку с фамилией своего родственника — участника боев, оставить фотографию или письмо с фронта. Сверху будут находиться красные знамена из металла, звезда и вывеска с названием.

После вводной от участника ВОВ ребята распределяют работу. Кому-то предстоит замешивать цементный раствор, кому-то — готовить площадку для укладывания бетонных плит. Ветеран сначала присматривает за молодежью, а потом, поняв, что ребята толковые, проводит экскурсию по мемориалу.

Для своих 92 лет Виктор Демьянович бодр, энергичен и обладает хорошей памятью: перечисляет десятки исторических фактов и дат. В годы войны он партизанил, потом в рядах регулярной армии воевал в Украине, Польше, освобождал Освенцим, Берлин, при взятии Бреслау его контузило.

Мемориал насчитывает десятки памятников павшим воинам. Виктор Терещенко останавливается возле могилы, где захоронены останки двух бойцов Красной Армии. Их в лесу во время сбора грибов нашли в землянке братья Кирилл и Владимир Мишурные, жители Коптей. «Принесли сохранившиеся останки, каски и вещи ко мне. У одного была медаль „За отвагу“, у второго — бритва с надписью. Через военкомат установили имена солдат — Петр Мельниченко и Макар Лоскутов, уроженцы Могилевской и Смоленской областей. Надмогильная плита стоит, осталось немного облагородить территорию вокруг нее», — говорит ветеран.

Есть здесь Линия памяти и скорби, где увековечены более 1,2 тыс. красноармейцев, которые погибли, освобождая Копти. Три года занимались уточнением списков героев. На 17 плитах указаны фамилия, имя, отчество и год рождения каждого, а также надпись с указанием того, что здесь сражались с нацистами люди разных национальностей. Рядом недавно высадили 40 саженцев дубов, и спустя годы здесь будет шуметь листьями целая аллея.

В своей брошюре, посвященной военным событиям, Виктор Терещенко пишет: «В окрестностях деревни Копти и прилегающих к ней хуторов и деревень в конце 1943 и начале 1944 года шли непрерывные кровопролитные бои. Согласно архивным документам здесь, на участке длиной 6 км, погибли 11 тыс. 408 солдат, сержантов и офицеров Красной Армии. 23 июня 1944 года 39-я армия 3-го Белорусского фронта взломала немецкий оборонительный рубеж в операции „Багратион“ (Витебское направление)».

В конце Виктор Демьянович подводит к трехметровому Кургану боевой славы, насыпанному по инициативе партизанского комбрига Даниила Райцева в 1994 году.

Комплекс посещают и белорусы, и иностранные гости. Некоторые приезжающие находят здесь имена своих родственников и знакомых. Летом Виктор Демьянович сам проводит экскурсии по мемориалу. Найти его не сложно: на входе в мемориал есть табличка с контактами.

После экскурсии Виктор Терещенко возвращается к парням. Смотрит, что они успели сделать, и хвалит за работу. На объекте еще есть над чем потрудиться, поэтому молодежь приедет сюда вновь в ближайшие выходные.

БелТА



ПАСЛАННЕ

КРАСАВІЦКІЯ ТЭЗІСЫ АЛЯКСАНДРА РЫГОРАВІЧА



Менш за паўтары гадзіны — Аляксандр Рыгоравіч уклаўся ў сціслы тэрмін, чытаючы пасланне да народа і парламента. Гэта лагічна, бо выглядала яно, як набор тэзаў. А чаго доўга размаўляць? Задачы пастаўленыя — працуйце!

Справа толькі ў тым, што ў такім выпадку патрэбы ў пасланні не было зусім.

Чырвонай ніткай сённяшняга паслання была тэза, агучаная яшчэ ў фільме «Брыльянтавая рука»: «Невінаватая я, ён сам прыйшоў!» І пачаў кіраўнік дзяржавы з таго, што акрэсліў вінаватых у нашым гаротным становішчы. Гэта, зразумела, не мы, а сусвет, у якім настала «эпоха нявызначанасці, непрадказальнасці і нестабільнасці», а таксама насаджэння уласных эканамічных і палітычных поглядаў і «нацыянальны эгаізм» нават партнёраў і саюзнікаў. Дзіва, што гэтым разам Аляксандр Рыгоравіч не нагадаў пра «сусветны эканамічны крызіс», якога, насамрэч, няма. Бачна, тое яму ўжо растлумачылі.

І, урэшце, падаецца, растлумачылі яму іншае: пра змену сістэмы гаспадаркі. Пра тое, што зараз «руляць» эфектыўныя менеджары, а перш чым ствараць нейкае прадпрыемства, трэба думаць не пра тое, што яно будзе выпускаць, а каму гэтую прадукцыю можна будзе прадаць.

Інавацыі

Прынамсі, галоўнай пазітыўнай тэзай гэтага паслання я б азначыў патрабаванне Лукашэнкі «даць свабоду дырэктарам прадпрыемстваў» і пазбавіць гэтыя самыя прадпрыемствы гіперапякунства з боку дзяржавы. Лукашэнка, урэшце, заўважыў, што, калі ўсе адказваюць за ўсё, ніхто не адказвае ні за што.

Але ці будзе яго пажаданне выкананае? «Кожны павінен займацца сваёй справаю, — але пры гэтым адказваць будзеце ўсе», — на карані задушыў сваю ж ініцыятыву беларускі правадыр.

Увогуле, слухаючы тэзісную ацэнку стану і перспектываў беларускай эканомікі ад Аляксандра Рыгоравіча, узнікала ўражанне, што ён чытае па паперцы тыя рэчы, сэнсу якіх да канца не разумее. Ён патрабаваў падвышаць інавацыйную актыўнасць прадпрыемстваў, скарыстоўваць геаграфічны патэнцыял краіны (пацікавіўся, чаму нашыя грамадзяне лётаюць у іншыя краіны з Кіева ці Вільні, а не з Мінску), кажучы пра развіццё прадпрымальніцтва, пераскочыў на праблемы глыбокай перапрацоўкі сыравіны. Пры гэтым фактычна заўважыў, што «мадэрнізацыя», у якую ўбуханыя мільярды долараў, так і засталася «на ўзроўні планаў». Кардонны завод у Добрушы не працуе, камбінат у Салігорску закрыўся праз тры месяцы працы, цэментныя заводы у заняпадзе, нафтахімія не вытрымлівае крытыкі...

А асабліва пацвярджае тэзу Аляксандра Рыгоравіча пра важнасць найперш рынкаў збыту сітуацыя з нашай любай беларускай АЭС. Па планах, першы яе энергаблок павінны запусціць ужо ў наступным годзе. Гэта маштабны 10-мільярдны інвестыцыйны праект, такога, па словах Лукашэнкі, у Беларусі не было і наўрад ці яшчэ будзе. Але нават яму пакуль ніхто не расказаў, як гэтая АЭС будзе ўбудаваная ў эканоміку Беларусі. Кажучы працэй — куды мы падзенем столькі электрычнасці.

Палітыка

Асобны для Лукашэнкі сёння быў палітычны складнік. Яго моцна ўразіў поспех чарговай «каляровай рэвалюцыі» ў Арменіі. І таму ён асобна спыніўся на магчымых зменах у Канстытуцыю, размова пра якія ходзіць ад нядаўняга часу.

Зразумела, Аляксандр Рыгоравіч заўважыў, Канстытуцыя — Асноўны закон, і як любыя законы, павінна змяняцца. Але ён «асабіста ні пра якія рэферэндумы не думаў», а толькі «чытаў у СМІ і чуў, што адказвала СМІ прадстаўнік ЦВК».

«З народам гуляцца нельга. Зменаў (Канстытуцыі) пад канкрэтную асобу ніколі не будзе — як гэта мы пабачылі на прыкладзе Арменіі. Не трэба было пераводзіць прэзідэнцкую рэспубліку ў парламенцкую, вось і адгукнулася. Навошта мяняць асновы дзяржавы, ламаць пад нейкую асобу? А калі потым асоба зламаецца, то што? Трэба спыніць гэтую валтузню, па-беларуску кажучы», — заявіў Лукашэнка.

І ўвогуле, дадаў ён, што «нам не да рэферэндумаў», а Асноўны закон можа дзейнічаць і з запісам пра неіснуючы ўжо Вышэйшы гаспадарчы суд.

Але ўсё ж кіраўніка краіны хвалявала міжнародная абстаноўка. Да Арменіі ён звяртаўся некалькі разоў. Сказаўшы, што «не трэба нам займацца глабальнай палітыкай, мы яе не робім і рабіць не будзем», потым зазначыў, што Беларусь змагла заняць уласную нішу ў свеце, стаўшы глабальным гульцом, дзякуючы ініцыятыве «Хельсінкі-2». «У нас няма залішніх амбіцый, але пры гэтым няма і комплексу аўтсайдэра», сказаў ён, дадаўшы, што без перафарматавання механізмаў бяспекі нас чакае вайна, і не «Другая сусветная».

Цікава, што ён перасцярог ад развязвання войнаў і агрэсіўнай рыторыкі «гаворачых галоваў» на расійскіх тэлеканалах, папярэдзіўшы, што менавіта яны ў выпадку канфлікту нідзе не адседзяцца.

Звыклае

Звыкла Лукашэнка абрынуўся на карупцыянераў і хабарнікаў. Маўляў, некаторыя людзі ў запаведніку рыбу кралі, дык «калі хочаце рыбы паесці — скажыце мне». Звыкла ён патрабаваў выкараніць пасярэднікаў, асабліва тых, хто пасярэднічае паміж беларускімі прадпрыемствамі. Звыкла ён казаў пра павышэнне эфектыўнасці працы. Гэтым разам, канешне, не прагучала «распранацца і працаваць», але было сказана выразна: «Менш слоў — больш справы». І тычылася гэта, як ні дзіўна, найперш чыноўнікаў і кіраўнікоў.

Увогуле, што было рассусольваць? Як сказаў правадыр, усе задачы ўжо пастаўленыя на адпаведных нарадах. І таму пасланне, падаецца, гэта проста такі «чароўны пендаль» адказным асобам, каб яны пачалі іх выконваць.

Можа, таму гэтае пасланне і было найкарацейшым і тэзісным.

А адзіная фраза, якая вартая запамінання з гэтага паслання: «Свет не стаў працейшым — ён стаў цікавейшым». І з гэтым цяжка не пагадзіцца.

Сяргей Пульша
«Новы час»

ЭКАЛОГІЯ

ЧЁРНЫЙ БИЗНЕС, КОТОРЫЙ ОСУЖДАЮТ И ЭКОЛОГИ, И ЦЕРКОВЬ

Собираясь на кладбище, многие люди покупают пластиковые украшения. Однако немногие задумывается о том, что это не только противоречит христианской традиции относительно мёртвых, но ещё и вредит живым. Такая «кладбищенская мода» характерна только для постсоветского пространства и была навязана в «лихие 90-е» беспринципными предпринимателями первой волны при поддержке китайской промышленности. И теперь более миллиона долларов ежегодно тратят беларусы на искусственные цветы, которые загрязняют нашу родину. Начни с себя — останови это кощунство!

Не превращайте могилу в клумбу

Облагораживание могил обосновано христианским вероучением. Религиозные люди называют покойных «усопшими» (уснувшими), но не «умершими», потому что верят, что в своё время они восстанут из гроба, а значит, могила — это место будущего воскресения. Поэтому она должна содержаться в чистоте и порядке, поясняется на официальном сайте Брестской епархии.

Что касается украшения могил, то для христиан главным является крест, который знаменует спасение и воскресение человека. Но мало кто думает об этом, приходя на кладбище, и обязательно приносит с собой дополнительное украшение — цветы. Так проявляется наша память и любовь к усопшим. Это естественно для человека, и здесь нет ничего странного. Главное — не превратить могилу в клумбу. Цветы принято приносить даже в храм, размещать их перед иконами. Но если в храм христиане приходят с живыми цветами, то на кладбище подавляющее большинство приносит искусственные.

«Церковь не имеет доктрины относительно такого явления. Но большинство священников в личных беседах высказываются против. Сам я тоже категоричен. Должно быть всё живое, иначе скоро станем все искусственными», — поделился Павел Романович, руководитель отдела по работе с молодёжью Брестской епархии.

Из чего состоят искусственные убранства?

Как правило, искусственные цветы изготавливают из большого количества компонентов. Лепестки — это синтетические ткани, например полиэстер, латекс, органза, обработанные различными химическими составами для придания пластичности и стойкости. Для окрашивания чаще всего используются анилиновые краски, представляющие собой достаточно токсичные соединения, которые могут оказывать негативное воздействие на здоровье, вызывая головокружение, головную боль, слабость.

Стебли, бутоны и иные декоративные элементы искусственных цветов в большинстве случаев изготавливаются из пластика, чаще всего ПВХ, который также довольно токсичен.

Сердцевины цветов и мелкие украшения могут изготавливаться из пенопласта. Пенопласт при нагревании может выделять канцерогенное вещество стирол, сообщается на сайте Центра экологических решений.

Можно ли их переработать?

В сельской местности отстоявшие свой век искусственные цветы с могил закапывают или сжигают. Экологи же настаивают, что мусор вообще нельзя сжигать. Во-первых, в составе мусора могут быть какие-то вторичные ресурсы, которые следовало бы отправить на переработку. А во-вторых, в состав украшений из пластика могут входить красители, пластификаторы и другие вещества, которые при сжигании попадут в воздух. В условиях открытого горения, где температура сравнительно небольшая — 200 градусов максимум, могут образовываться новые опасные химические соединения.

Искусственные цветы и венки нельзя и закапывать, так как материал, из которого они изготовлены, разлагается более ста лет, что крайне негативно сказывается на состоянии окружающей среды…

Существует альтернатива...

Использование искусственных украшений чаще всего обусловлено желанием сэкономить. Считается, что «пластик» дешевле живых цветов и гораздо долговечнее.

На самом же деле искусственные цветы на солнце довольно быстро теряют свой товарный вид.

Альтернативой покупки живых и искусственных цветов является благоустройство могилы в виде посадки

(працяг на стар. 4)

ЭКАЛОГІЯ

(пачатак на стар. №3)

растений, кустарников и вечнозелёных хвойных деревьев. Можно высадить луковичные сорта (лилии, крокусы, ландыши), полевые (космосы, циннии, бархатцы), а также герани, хризантемы и розы, сообщается в источнике funeral.by.

«Живые цветы особо люди не закупают и ими могилы не оформляют. У нас был опыт: недавно мы делали такой эксперимент: оформили живыми цветами могилу после захоронения. В принципе, получилось неплохо. По деньгам, в целом, это не намного дороже, чем искусственными венками. Конечно, что-то приживется, что-то нет, так что есть риски определённые. И уход, конечноже, необходим дополнительный. Пока же люди предпочитают искусственные цветы. С ними проще, ассортимент больше и по цветовой гамме и по оформлению. Это стало уже традиционно, поэтому производство искусственных цветов сегодня широко развито в ритуальном бизнесе», — объяснил Алексей Шевердин.

Делаем выводы

Ежегодно только на Пасху мёртвых (Радоницу) места захоронения в Беларуси посещают около 1,5 млн человек. Если каждый третий принесёт на кладбище два искусственных цветка, то на могилах их окажется около миллиона. В среднем каждый из них стоил в этом году около 2 рублей (20 тысяч по ценам до деноминации). В сумме получается 2 млн беларусских рублей (20 млрд — до деноминации), или около 1 млн долларов США. Впечатляет? А ведь кто-то покупает дорогостоящие искусственные венки, а не пару цветочков. Кроме того, украшения на кладбище несут не только на Радоницу, но и в течение всего года.

А теперь подумайте: на что вы тратите эти деньги? На мусор, который загрязняет окружающую среду. Может, стоит уже обратить внимание на более экологичный вариант? Например, посадить неприхотливые живые растения на могилах своих родственников.

Ирина Шатило
http://greenbelarus.info

НАРОДНЫ ПРАТЭСТ

В АРМЕНИИ УЛИЦА СБРОСИЛА САРГСЯНА

Режим Лукашенко гораздо жестче армянского, но это не гарантия от потрясений, поскольку тают возможности обеспечить белорусам достойную жизнь...

Неожиданные, молниеносные протесты в Ереване привели к отставке Сержа Саргсяна, занявшего кресло премьера лишь несколько дней назад. Это ошеломляющая новость для всех авторитарных режимов постсоветского пространства, включая белорусский, боящихся как огня всяких майданов.

Фишка в том, что Саргсян хоть и занял премьерское кресло только-только, но успел изрядно поднадоесть армянам за десять лет президентства. Вдобавок сограждан возмутила хитрая рокировочка, поскольку в результате перелицовки конституции к премьеру от президента перекочевала львиная доля властных полномочий…

В Беларуси режим жестче

Конечно, глупо проводить примитивные параллели, прокламировать лозунги типа: сегодня — Ереван, завтра — Минск. Но армянские события — звоночек белорусскому руководству.

Режим, который выстроил Лукашенко, гораздо жестче армянского. Там худо-бедно идет некая ротация властных элит и персоналий, 9 апреля вступил в должность уже четвертый постсоветский президент Армен Саркисян. Лукашенко же кресло главы государства как занял, так и не уступает с 1994 года.

Именно на жесткость он и делает ставку. Силовые структуры, заточенные на подавление волнений, выхолены и вышколены, оснащены по последнему слову. Как тяжелые боевые роботы из фантастических фильмов, белорусские силовики методично и бесстрастно выполняют по команде свою усмирительную миссию.

Массовыми арестами закончилась Площадь 2006 года. За семь с половиной минут, как хвалился Лукашенко, зачистили Площадь в 2010-м, лидерам и активистам протеста впаяли тюремные сроки. Так же методично были перемолоты протесты против декрета «о тунеядцах» в прошлом году…

Саргсян, который сдался за считаные дни, в глазах Лукашенко наверняка выглядит жалким слабаком. Ранее белорусский официальный лидер презрительно говорил о малодушии сбежавшего из Украины Виктора Януковича. Сам Лукашенко заявлял некогда, что готов защищать власть президента даже лично с оружием в руках. И в минуты внутренних кризисов он бестрепетно дает отмашку на зачистку улиц и площадей от бунтующего элемента.

Экономические чудеса кончились

Второй момент: Армения — одна из самых бедных постсоветских стран, что априори подогревает народное недовольство. Лукашенко же удавалось долгое время обеспечивать заметно более высокий, даже приличный по постсоветским меркам уровень жизни сограждан. И политологи констатировали этакий негласный социальный контракт: мол, белорусы согласились пожертвовать правами и свободами за чарку и шкварку.

В общем, верхушке белорусского режима не стоит обольщаться, что она схватила бога за бороду в плане внутренней стабильности.

Но чудеса кончились. Москва урезала субсидии, нереформированная белорусская экономика стала все сильнее сбоить, средняя зарплата белорусов в долларовом эквиваленте сегодня ниже, чем в 2010-м. По уровню жизни граждан страна все сильнее отстает даже от соседей — далеко не самых богатых стран ЕС. И без экономических реформ, как дружно предрекают международные эксперты, это отставание будет нарастать.

А значит, будет нарастать и недовольство белорусов. У руководства страны два пути: непопулярные реформы или зажимание гаек.

Лукашенко никогда не был реформатором, а чем дольше человек у власти, тем страшнее порушить привычный порядок вещей. Реформы неизбежно увеличат безработицу, социальное расслоение, породят недовольство аутсайдеров, то есть усилят риск тех самых протестов. Вдобавок с утратой массива госсобственности будет утрачена и одна из опор авторитарной власти.

Вообще — чем заниматься, когда миссия командовать экономикой окажется неактуальной? Править по-другому нынешняя властная элита не умеет. А уступать место не хочет. Сама идея ротации властных элит, эта обыденность европейских демократий, белорусской верхушке ненавистна.

Модернизацию же экономики хотят свести к созданию прорывного IT-кластера, не трогая массив неэффективного госсектора (да еще и айтишников подмять под специальное министерство). Но этот замысел попахивает утопией. Или антиутопией.

Беларуси нужны комплексные реформы. Включая общественно-политическую сферу. Однако Лукашенко уже признавался, что от демократизации его тошнит. Сегодня мы видим, что сворачивается даже та хилая оттепель, которую имитировали ради нормализации отношений с Европой. Решено, что Европа перетопчется…

Трансформация требует мудрости и мужества элит

Вновь-таки: было бы поверхностно делать вывод, что вот, рано или поздно и в Беларуси, как в Армении, сорвет крышку котла. У белорусского режима пока немалый запас прочности. Да и народ у нас не чета горячим южанам. Про терпеливость, памяркоўнасць белорусов сложены анекдоты.

У властей, загнавших экономику в застойное болото, все меньше возможностей обеспечивать гражданам достойную жизнь. Контраст между Беларусью и соседями из ЕС — не в пользу Беларуси — будет усиливаться.

И даже если удастся избежать социальных потрясений, то это будет пиррова победа. Страна, у которой стартовые постсоветские возможности были лучше, чем у Польши или Чехии, будет только глотать за ними пыль. Такова цена консервации нынешней системы.

Не факт, что армянский протест изменит таможнюю систему. Вообще я лично не адепт бунтов, социальных потрясений, революций. Революция всегда сопровождается насилием, косит без разбору и, да, часто поднимает на гребень волны авантюристов. Системная трансформация под эгидой ответственных, мудрых элит была бы для Беларуси не только гуманнее, но и гораздо продуктивнее. Однако очень похоже на то, что белорусский персоналистский режим к трансформации не приспособлен, чересчур ригиден. А потому будущее страны туманно, непредсказуемо и тревожно.

Александр Класковский
«Белапан»

НАША ЖЫЦЦЁ

ШТРАФ ЗА ГАРБАТУ І «ЧЫРВОНЫЯ ЛЮДЗІ»

Некалькі, здаецца, разрозьненых фактаў.

У Віцебску суд прызнаў вінаватымі восем чалавек, якія сабраліся на кватэры, пілі гарбату і пра нешта размаўлялі. На прадпрыемстве «Менскія цеплавыя сеткі» прымусова зьбіраюць па 5 рублёў на беларускі Чырвоны Крыж. Тым, хто адмаўляецца плаціць, пагражаюць праблемамі і зьніжэньнем заробку.

Здавалася б, нічога новага, падобныя факты здараюцца рэгулярна. Але калі яны амаль аднакчасова трапляюць на стужку навінаў, то вымалёўваецца даволі дакладная карціна грамадзкага жыцьця краіны. Нібы з савецкіх часоў нічога не памянялася.

Нобэлеўская ляўрэатка Сьвятлана Алексіевіч у нядаўнім інтэрвію парталу tut.by кажа: «Вы хочаце сказаць, што беларусы жывуць у 21 стагодзьдзі? Ды мы ўсё яшчэ пры сацыялізьме. У нас сацыялістычная вытворчасьць, кіраваньне, мысьленьне. З чаго вы ўзялі, што ўсё іншае? Калі мне кажуць, што гэта гісторыя, я не згаджаюся... Што да Беларусі, то тут вельмі шмат „чырвонага чалавека", паколькі мы не зжылі сацыялістычнае грамадзтва. У нас час спынены. Мяняецца горад, машыны становяцца іншыя, але людзі — не».

Быў у беларускай гісторыі кароткі дэмакратычны пэрыяд на пачатку 1990-х гадоў, калі ўладу можна было свабодна крытыкаваць, нават патрабаваць яе адстаўкі. Але ў масавай сьвядомасьці ён адлюстраваўся як час хаосу, бязладзьдзя, беспарадку. Гэта быў пэрыяд, калі якога, па словах Лукашэнкі, «улада валялася ў брудзе».

Паводзіны ўладаў якраз ня дзівяць. Бо вядома, што ў любой краіне дзяржаўныя інстытуты робяць так, як дазваляе народ. Іншая рэч, што існы рэжым штучна кансэрвуе сацыяльныя ўмовы, якія ўзнаўляюць, рэпрадукуюць залежнасьць насельніцтва ад дзяржавы.

Гэткія культурныя асаблівасьці беларусаў становяцца пэўнай перашкодай на шляху да мадэрнізацыі беларускага грамадзтва. Бо новая эпоха патрабуе свабоднага чалавека. Зразумела, значная частка людзей кампэнсуе несвабоду ў рэале свабодай у віртуале, у сацыяльных сетках. Такая своеасаблівая сублімацыя. Такім чынам народ выпускае пару. Але і тут улады імкнуцца заткнуць рот з дапамогай новага закону аб СМІ.

А што ж пасіянарная частка грамадзтва? Чаму ж яна аказалася ня здольная павесьці за сабой народ? Значная колькасьць такіх людзей за гэтыя чвэрць стагодзьдзя незалежнасьці зьехала за мяжу. Астатніх улады моцна трымаюць у гета. Да таго ж беларусы ня надта шануюць герояў. Гэта таксама ўнікальнасьць беларускага соцыюму. Падчас сацыялягічных апытаньняў наконт беларускіх герояў большасьць рэспандэнтаў аказваецца ў вялікім задуменьні. Бо гераічныя асобы разбураюць нацыянальны стэрэатып: не высоўвайся, жыві як усе.

Валер Карбалевіч
«Радыё Свабода»

Заснавальнік і рэдактар: Смолікаў Канстанцін Эдуардавіч

Адрас рэдакцыі: г. Віцебск, вул. 1-я Сененская д.5, Тэл. +375-29-218-98-38, e-mail: kas_vit@tut.by
Газета выдаецца з лютага 2014 г.

Падпісана да друку 28.04.2018 у 15.20
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца пры падтрымцы аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.